# Тэма 3. ГЕАГРАФІЧНЫЯ ЛАНДШАФТЫ. ГЕАЭКАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСІ

## § 14. Геаграфічныя ландшафты і асваенне тэрыторыі

***Узгадваем.*** *Якія прыродныя кампаненты ўключаюць прыродныя комплексы? Якія віды гаспадарчай дзейнасці гістарычна складаліся ў Беларусі?*

**Паняцце пра ландшафт.** Зямная кара, паветра, воды, глебы, раслінасць і жывёльны свет — часткі геаграфічнай абалонкі. Іх называюць прыроднымі кампанентамі. Прыродныя кампаненты ўзаемазвязаны паміж сабой (мал. 61). Так, рэльеф — вынік узаемадзеяння літасферы, гідрасферы, атмасферы і біясферы.

Заканамернае спалучэнне прыродных кампанентаў, якія ўтвараюць адзіную сістэму, называецца прыродна-тэрытарыяльным комплексам (ПТК). Мясцовасць з аднатыпным рэльефам і горнымі пародамі, кліматам, глебамі, раслінным і жывёльным светам называюць яшчэ **ландшафтам**. У перакладзе з нямецкай ландшафт — від мясцовасці. Ці можна лічыць названыя тэрміны аднатыпнымі паняццямі?

**Ландшафт** — генетычна аднастайны прыродна-тэрытарыяльны комплекс, які складаецца з узаемазвязаных прыродных кампанентаў.




Мал. 61. Узаемадзеянне прыродных кампанентаў у ландшафце

Спалучэнне прыродных кампанентаў у ландшафце ўяўляе сабой яго вертыкальную будову. Простыя ландшафты займаюць форму рэльефу (узгорак, яр, западзіну) і характарызуюцца своеасаблівым кліматам, арганічным светам. Яны ўзаемадзейнічаюць з суседнімі ПТК і ўтвараюць больш складаныя ландшафты: раўніны, горныя сістэмы, прыродныя зоны. Буйныя прыродныя комплексы — мацерыкі і акіяны, а самы буйны — геаграфічная абалонка. Спалучэнне простых ландшафтаў у больш складаным — гэта гарызантальная будова ландшафту.

Змена любога прыроднага кампанента прывядзе да змены ландшафту, які

характарызуецца ўстойлівасцю да знешняга ўздзеяння і сезоннай рытмікай. *Прывядзіце прыклады ўзаемадзеяння прыродных кампанентаў у ландшафце.* Своеасаблівасць ландшафтаў Беларусі абумоўлена гісторыяй іх утварэння. Найбольшае ўздзеянне на іх фарміраванне аказалі зледзяненні. Назва ландшафту адлюстроўвае рэльеф, тыповыя глебы і расліннасць. Пры характарыстыцы ландшафтаў выкарыстоўваюцца скарочаныя назвы, напрыклад, водна-ледавіковы ландшафт.

**Класіфікацыя прыродных ландшафтаў.** Марэнныя ўзгоркі са стромкімі схіламі і плоскія нізіны, хваёвыя бары, дубровы, азёры, балоты, буйныя рэкі з абрывістымі берагамі і ручаі, паросшыя хмызняком, — усё гэта тыповыя ландшафты Беларусі. Кожны з іх непаўторны, але ва ўсіх можна знайсці блізкія рысы. Гэта дае падставу аб'ядноўваць ландшафты ў групы. Навукоўцамі прапанавана схема класіфікацыі ландшафтаў (мал. 62).

Тэрыторыя Беларусі размешчана ў межах Усходне-Еўрапейскай раўніны, таму яе ландшафты адносяцца да *класа раўнінных*. Па суадносінах цяпла і вільгаці вылучаюцца *тыпы* ландшафтаў. Беларусь знаходзіцца ў ляснοй зоне ўмеранага кліматычнага пояса, таму ландшафты адносяцца да *ўмерана-кантынентальнага ляснога тыпу*. Па тэрыторыі Беларусі праходзіць мяжа змешаных і шыракалістых лясоў. Гэта дало падставу вылучыць два *падтыпы* ландшафтаў: *змешана-лясны* і *шыракаліста-лясны (палескі)*. Першы з іх ахоплівае паўночную і цэнтральную часткі краіны (амаль 3/4 усёй тэрыторыі), другі — Беларускае Палессе. У кожным з падтыпаў па асаблівасцях утварэння вылучаюцца *роды* ландшафтаў, якія, у сваю чаргу, падзяляюцца на *віды*.




Мал. 62. Класіфікацыя ландшафтаў Беларусі

**Характарыстыка ландшафтаў.** У залежнасці ад займаемай плошчы ландшафты падзяляюцца на *самыя распаўсюджаныя (дамінантныя)*, *тыповыя* і *рэдкія*. Дамінантнымі ў Беларусі з'яўляюцца водна-ледавіковыя і другасна-марэнныя ландшафты. На іх долю прыпадае 35 % тэрыторыі краіны. Да групы тыповых ландшафтаў адносяцца пяць родаў, якія займаюць сумарна 40 %. Астатнія ландшафты адносяцца да групы рэдкіх (7 родаў ландшафтаў), таму што плошча кожнага з іх не перавышае 5 % (мал. 63).




Мал. 63. Размеркаванне ландшафтаў Беларусі па займаемай плошчы, %

*Водна-ледавіковыя ландшафты* сустракаюцца паўсюдна і займаюць каля 20 % плошчы краіны. Рэльеф ландшафтаў утвораны талымі водамі ледавікоў. Характэрная хвалістая паверхня з адноснымі перавышэннямі да 10 м. Пераважаюць пясчаныя дзярнова-падзолістыя глебы, часта забалочаныя. Ландшафт характарызуецца высокай лясістасцю. Шырока прадстаўлены бары і бярэзнікі. Вялікія прасторы занятыя поймавымі лугамі і нізіннымі балотамі.

*Другасна-марэнныя раўніны* займаюць каля 15 % плошчы Беларусі. Рэльеф мала адрозніваецца ад водна-ледавіковых ландшафтаў, але ўтвораны адкладамі доннай марэны. Дзярнова-падзолістыя суглінкавыя глебы ўрадлівыя, таму ландшафт добра асвоены. Яго разворанасць звычайна перавышае 40 %.

Знайдзіце на карце атласа (с. 23) асноўныя раёны распаўсюджання водна-ледавіковых ландшафтаў і другасна-марэнных раўнін.



Мал. 64. Азёрна-балотны ландшафт

Адным з найбольш складаных па будове з'яўляецца *ўзгорыста-марэнна-эразійны ландшафт*. На яго долю прыпадае амаль 8 % плошчы краіны. Ландшафт прымеркаваны да канцова-марэнных узвышшаў Беларускай грады. *Якія характэрныя рысы рэльефу ўзвышшаў?* Да тыповых адносяцца *марэнна-зандравыя ландшафты*, размешчаныя ў цэнтральнай частцы Беларусі, і *азёрна-балотныя ландшафты*, распаўсюджаныя на Палессі (мал. 64). Яны займаюць па 8–9 % плошчы краіны. Амаль такія ж плошчы займаюць *азёрна-алювіяльныя ландшафты* і *алювіяльныя*

*тэрасіраваныя ландшафты*. Фарміраванне рэльефу ландшафтаў звязана з акумулятыўнай дзейнасцю рэк. У раслінным покрыве ландшафтаў пераважаюць лясы, поймавыя лугі і нізінныя балоты. Распаўсюджаны яны на Палессі ў даліне Прыпяці.

З *рэдкіх* распаўсюджаны камава-марэнныя, лёсавыя і азёрна-ледавіковыя ландшафты. *Камава-марэнныя ландшафты* характарызуюцца складаным рэльефам: чаргаваннем камаў і марэнных узгоркаў, *озавых град*, западзін, азёрных катлавін. *Лёсавыя ландшафты* распаўсюджаны на ўсходзе Беларусі (мал. 65). Наяўнасць лёсападобных адкладаў абумоўлівае распаўсюджанне яроў і лагчын, суфазійных западзін. *Азёрна-ледавіковыя ландшафты* прымеркаваны да Полацкай нізіны і характарызуюцца плоскім рэльефам і пераўвільгатненнем суглінкавых глеб.



Мал. 65. Лёсавы ландшафт

**Віды асваення тэрыторыі.** У працэсе гаспадарчай дзейнасці чалавек выкарыстоўвае прыродныя ландшафты. Рост колькасці жыхароў Зямлі прывёў да неабходнасці асваення новых зямель. У працэсе гаспадарчай дзейнасці высякаюцца лясы, разворваюцца землі, узводзяцца населеныя пункты, пракладваюцца дарогі, здабываюцца карысныя выкапні. Такім чынам, *асваенне тэрыторыі* — гэта яе выкарыстанне для розных відаў дзейнасці. Пачынаецца яно з засялення тэрыторыі людзьмі. Яе асваенне прыводзіць да ператварэння прыродных ландшафтаў у антрапагенныя. *Якія прыродныя рэсурсы і ўмовы Беларусі прыводзяць да асваення тэрыторыі? Прывядзіце прыклады.*

У адпаведнасці з напрамкамі гаспадарчай дзейнасці насельніцтва ў Беларусі вылучаюцца чатыры асноўныя віды асваення тэрыторыі: сельскагаспадарчае, прамысловае, транспартнае, рэкрэацыйнае (мал. 66).




Мал. 66. Асноўныя віды асваення тэрыторыі Беларусі

*Сельскагаспадарчае асваенне.* Са старажытных часоў людзі высякаюць лясы і асвойваюць землі пад ворыва. Таму ў Беларусі распаўсюджаны

ландшафты з чаргаваннем сельгасугоддзяў і лясоў. Сельскагаспадарчыя ўгоддзі займаюць больш урадлівыя землі і шырэй прадстаўлены ў цэнтральнай частцы краіны. У структуры зямельнага фонду Беларусі іх доля складае 41 % , а ў самых асвоеных раёнах — да 80 % тэрыторыі.

*Прамысловае асваенне*. У месцах размяшчэння радовішчаў карысных выкапняў асноўным відам асваення тэрыторыі з'яўляецца прамысловае. Прамыслова асвоеныя землі маюць абмежаванае распаўсюджанне, але пераўтварэнне прыродных ландшафтаў у іх самае моцнае. Будаўніцтва кар'ераў, шахт, прамысловых аб'ектаў цалкам змяняе ландшафты. У Беларусі парушаныя землі займаюць каля 2 % тэрыторыі, а яшчэ каля 3 % занята населенымі пунктамі, у якіх таксама пераважае прамысловае асваенне зямель.

*Транспартнае асваенне*. Сельскагаспадарчае асваенне прывяло да фарміравання ў Беларусі густой сеткі паселішчаў, наяўнасць сельскіх і гарадскіх паселішчаў — да транспартнага асваення тэрыторыі. У рэспубліцы склалася густая сетка чыгуначных і аўтамабільных дарог. Сярэдняя гушчыня чыгунак складае больш за 26 км/1000 км$^2$, а аўтамабільных дарог — каля 490 км/1000 км$^2$. Па ўзроўні транспартнага асваення Беларусь пераўзыходзіць многія краіны СНД і Еўропы.

*Рэкрэацыйнае асваенне*. У другой палове XX ст. пачалося актыўнае рэкрэацыйнае асваенне тэрыторыі. У многіх краінах турызм з'яўляецца асноўнай крыніцай даходу дзяржавы.

**Антрапагенныя ландшафты.** Прыродныя ландшафты, змененыя дзейнасцю чалавека, атрымалі назву **антрапагенных**. Толькі запаведнікі можна разглядаць як амаль нязмененыя ландшафты. Узнікаюць антрапагенныя ландшафты двума шляхамі: мэтанакіравана (сельскагаспадарчыя палі, вадасховішчы, паселішчы чалавека) або ў выніку аварый, здабычы карысных выкапняў і г. д.

**Антрапагенны ландшафт** — прыродны ландшафт, у рознай ступені пераўтвораны гаспадарчай дзейнасцю.

У наш час больш за 90 % тэрыторыі Беларусі занята антрапагеннымі ландшафтамі. Па ступені ўздзеяння яны падзяляюцца на моцна змененыя (ворныя землі, населеныя пункты, дарогі), сярэдне змененыя (лугі і сенажаці) і слаба змененыя (лясы і балоты). У залежнасці ад відаў гаспадарчай дзейнасці і асвоенасці тэрыторыі антрапагенныя ландшафты падзяляюцца на *сельскагаспадарчыя*, *лясныя*, *водагаспадарчыя*, *горнапрамысловыя*, *сялібныя*, *рэкрэацыйныя* і *прыродаахоўныя* (мал. 67). Найбольш шырока прадстаўлены лясныя і сельскагаспадарчыя ландшафты. Населеныя




Мал. 67. Антрапагенныя ландшафты

пункты адносяцца да сялібных ландшафтаў, водныя аб'екты — да водагаспадарчых. Рэкрэацыйныя і прыродаахоўныя ландшафты звычайна ўключаюць участкі лясоў, азёры і вадасховішчы.

**Абагульнім і запомнім.** Асноўныя адзінкі класіфікацыі ландшафтаў Беларусі: класы, тыпы, падтыпы, роды і віды. Да дамінантных у Беларусі адносяцца водна-ледавіковыя і другасна-марэнныя ландшафты, якія сумарна займаюць 35 % тэрыторыі. Тыповыя ландшафты: узгорыста-марэнна-эразійныя, марэнна-зандравыя, азёрна-балотныя, алювіяльныя тэрасіраваныя і азёрна-алювіяльныя — займаюць 8–9 % тэрыторыі краіны кожны. Сярод рэдкіх ландшафтаў сустракаюцца камава-марэнныя, лёсавыя і азёрна-ледавіковыя. Асноўныя віды асваення тэрыторыі: сельскагаспадарчае, прамысловае, транспартнае, рэкрэацыйнае.

1. Якія прыродныя кампаненты з'яўляюцца структурнымі часткамі ландшафтаў? 2. Якая класіфікацыйная адзінка ландшафтаў Беларусі з'яўляецца самай буйной, а якая — самай дробнай? 3. З якога віду гаспадарчай дзейнасці пачыналася асваенне тэрыторыі Беларусі? 4. Які від асваення тэрыторыі з'яўляецца самым маладым у Беларусі? 5. Якія тыпы антрапагенных ландшафтаў вылучаюцца ў Беларусі?

6. Прывядзіце прыклады трансфармацыі ландшафту ў выніку змены расліннасці, жывёльнага свету. 7. Растлумачце, чым адрозніваецца вертыкальная будова ландшафту ад гарызантальнай. 8. Параўнайце ўзровень гаспадарчай асвоенасці асобных абласцей Беларусі. Якая з іх найбольш асвоеная ў сельскагаспадарчым, прамысловым, транспартным і рэкрэацыйным дачыненні?

***Ад тэорыі да практыкі.*** 1. Падрыхтуйце прэзентацыю пра прыродныя і антрапагенныя ландшафты вашай мясцовасці. 2. На прыкладзе сваёй вобласці або раёна пакажыце залежнасць узроўню асвоенасці ад прыродных умоў. Падрыхтуйце паведамленне пра асвоенасць тэрыторыі раёна.